

У дні майскіх свят па Беларускай чыгунцы будуць курсіраваць дадатковыя цягнікі.

Усяго ў раскладзе руху з'явіцца 100 дадатковых цягнікоў у міжнародных зносінах і 52 — у міжрэгіянальных. СТАР 2



Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

30 КАНАЛАЎ



Нішто так не мяняе вобраз чалавека, як прычоска... Вось чаму выбар стрыжкі – адказная і складаная справа, бліскуча справіцца з якой дапаможа гараскоп стрыжак на май. СТАР 6

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 мая 2013 г. ПЯТНІЦА № 81 (27446) Кошт 1500 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# РАЗВІТАЯ СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА — ДАБРАБЫТ НАРОДА І СТАБІЛЬНАСЦЬ ДЗЯРЖАВЫ

**Беларусь поўнасцю забяспечыла сваю харчовую бяспеку, стварыўшы магчымасці для інтэнсіўнага развіцця сельскай гаспадаркі. Аб гэтым кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка заявіў, наведваючы Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт (БДАТУ), паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Аляксандр Лукашэнка сустрэўся са студэнтамі і выкладчыкамі ВНУ, адказаў на ўсе пытанні, якія іх цікавілі. Кіраўнік дзяржавы зайшоў у аўдыторыю падчас лекцыі на тэму выкарыстання нетрадыцыйных крыніц энергіі ў сельскай гаспадарцы і прыняў актыўны ўдзел у дыскусіі.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ва ўсім свеце ідзе барацьба за доступ да энергарэсурсаў і, у першую чаргу, да вуглевадароднай сыравіны. Менавіта таму пытанне атрымання энергіі з нетрадыцыйных крыніц і максімальнае выкарыстанне мясцовых рэсурсаў становяцца ўсё больш актуальнымі. «Да канца гэтай пяцігодкі мы павінны выйсці на 30 працэнтаў электраэнергіі, якая выпрацоўваецца з уласных крыніц. І атамная электрастанцыя — гэта мінус 5 млрд куб.м прыроднага газу», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Гаворачы аб сельскай гаспадарцы, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што кожная дзяржава, якая імкнецца да ўстойлівага развіцця, самастойнасці і дабрабыту надае аграпрамысловаму комплексу асаблівую ўвагу: «Сельская гаспадарка — гэта і прадукты харчавання, якія ўсім патрэбны кожны дзень, і сыравіна для перапрацоўчай прамысловасці, і сфера дзейнасці значнай часткі насельніцтва. Ад стану спраў у гэтым сектары эканомікі залежаць дабрабыт народа і стабільнасць дзяржавы».

Паводле слоў Прэзідэнта, цяпер Беларусь поўнасцю задавольвае свае патрэбнасці ў прадуктах харчавання і амаль палавіну пастаўляе на экспарт. Па выніках 2012 года яго аб'ём склаў больш як $5 млрд, а да канца 2015 года павінна быць $7 млрд. «Можна ганарыцца тым, што ў разліку на душу насельніцтва асноўных відаў сельскагаспадарчай прадукцыі Беларусь займае першае месца сярод краін СНД. Па вытворчасці мяса мы зраўняліся з Германіяй, а па малаку прыкладна ў два разы перавышаем асноўныя развітыя ў аграрных адносінах еўрапейскія краіны», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў аб рэалізацыі ў 2005-2010 гадах маштабнай дзяржпраграмы адраджэння і развіцця вёскі. Калі тады асноўны ўпор рабіўся на развіццё сацыяльнай сферы, каб стварыць спрыяльныя ўмовы для жыцця людзей у вёсцы, то сёння, паводле слоў кіраўніка дзяржавы, неабходна сканцэнтравацца на развіцці вытворчай сферы. Цэнтрам сельскага жыцця ў перспектыве павінны стаць сучасныя аграгарадкі, а сельская гаспадарка ў цэлым павінна быць больш эфектыўнай. «Нам ні ў якім выпадку нельга рэзаць буйныя гаспадаркі на кавалкі. Мы не супраць фермераў, але за буйнатаварнай гаспадаркай будучыня», — упэўнены Прэзідэнт.

Усяго ў Беларусі створана амаль паўтары тысячы аграгарадкоў, дзе забяспечаны сацыяльныя стандарты для пражывання.

Для паспяховага развіцця сельскай гаспадаркі не менш важна і падрыхтоўка кваліфікаваных кадраў. Тут кіраўнік дзяржавы патрабуе ў першую чаргу рабіць упор на практычную падрыхтоўку студэнтаў падчас навучання ў ВНУ. Разам з тым, Прэзідэнт канстатаваў некаторае адставанне аграрнай адукацыі ад патрабаванняў сучаснай вытворчасці, што ў многім абумоўлена ўстарэлай навучальнай базай. У той жа час кіраўнік дзяржавы адзначыў, што гэтаму ёсць і аб'ектыўныя прычыны: «Хутка змяняюцца тэхналогіі і іх тэхнічнае забеспячэнне. Мы, ды і не толькі мы, ніколі не паспеем пад іх аснасціць навучальны працэс. Вось чаму пастаўлена пытанне аб пераглядзе праграм навучання такім чынам, каб будучы малады спецыяліст на апошніх курсах атрымаў максімум вытворчых навыкаў і ведаў, праходзячы навучанне большую частку часу не ў аўдыторыях ВНУ, а непасрэдна на вытворчасці, у канкрэтных гаспадарках».

Студэнты задалі кіраўніку дзяржавы шэраг пытанняў, звязаных з іх непасрэднай спецыялізацыяй — сельскай гаспадаркай. У прыватнасці, цікавіла **магчымасць павышэння закупачных цэн на сельгаспрадукцыю насельніцтва.** Прэзідэнт паабяцаў, што закупачныя цэны значна зменяцца ў бок павелічэння.

Спыталі кіраўніка дзяржавы і **аб перспектывах далейшага развіцця ў краіне льнаводчай галіны.**

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Беларусь у бліжэйшыя гады поўнасцю мадэрнізуе вытворчасць ільняных вырабаў.

Паводле яго слоў, пытаннямі мадэрнізацыі вытворчасці і перапрацоўкі лёну ў Беларусі займаюцца непасрэдна «ад поля да льнокамбіната». «Паглядзіце на герб — там канюшына і лён. Таму нават палітычна мы не можам адысці ад гэтай культуры», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Адказваючы на пытанне, якое датычылася **перспектыў аб'яднання беларускага «Гомсельмаша» і расійскага «Растсельмаша»,** Прэзідэнт адзначыў, што гэта было б вельмі выгаднай здзелкай. У той жа час кіраўнік дзяржавы канстатаваў адсутнасць прагрэсу ў перагаворным працэсе.

«Для нас гэта было б вельмі выгадна, калі б яны згадзіліся на тыя ўмовы, якія ім прапанаваны, таму што «Растсельмаш» сёння вельмі слаба працуе. Але гэта адзін з самых магутных у свеце вытворцаў сельгастэхнікі. Гэта вялікі рынак, і калі мы ўзялі б пад кантроль гэта прадпрыемства, мы кантралявалі б увесь расійскі рынак», — адзначыў Прэзідэнт.

Аднак, паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, свае інтарэсы ёсць і ў беларускага боку, у прыватнасці, было прапанавана набыць «Растсельмаш» і, аб'яднаўшыся, давесці яго да ўзроўню «Гомсельмаша», пастаўляць сумесную прадукцыю на рынкі. «Думаюць. Мне здаецца, гэтыя думы скончацца нічым. Пойдуць яны на гэта — добра, але, мне здаецца, не вельмі яны да гэтага гатовы і не вельмі спяшаюцца».

Студэнты пацікавіліся **перспектывамі будаўніцтва арэнднага жылля ў Мінску,** а таксама іпатэчнага крэдытавання.

«Арэнднае жыллё з часам будзе абсалютным прыярытэтам у будаўніцтве жылля», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Як расказаў старшыня Мінгарвыканкама Мікалай Ладуцька, у гэтым годзе ў сталіцы плануецца ўвесці пяць арэндных дамоў, у наступным — 10. Акрамя таго, у арэнднае жыллё пераведзена ўжо 200 кватэр, якія размеркаваны маючым патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў грамадзянам.

Прэзідэнт лічыць, што вырашэннем жыллёвага пытання павінны займацца кіраўнікі арганізацый і прадпрыемстваў, будуючы сваім работнікам арэнднае жыллё. «Кіраўнік павінен узяць тыпавы праект, прывязаць яго да вашых умоў і будаваць. Крыніцы фінансавання могуць быць розныя, падумайце. Чымсьці і мы можам дапамагчы», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Мы гэта апрабавалі ўжо, а цяпер не чакайце, што толькі дзяржава пабудуе за кошт бюджэту, давайце і на месцах», — дадаў Прэзідэнт.

СТАР 2

## БУДАВАЦЬ САМАЛЁТЫ – ГЭТА ЛЁГКА!



Настаўнік працоўнага навучання другой Быхаўскай школы **Аляксандр ВІШНЯКОЎ** дваццаць гадоў быў ваенным штурманам, лятаў на самалётах ТУ-22М2. Служыў у Хабараўскім краі, а ваенную кар'еру завяршыў у 57-й дывізіі марской авіяцыі, якая базіравалася ў беларускім горадзе на Дняпры. Пасля сыходу ў адстаўку застаўся жыць у Быхаве і ўжо пятнаццаць гадоў працуе ў школе. Адно з захапленняў былога лётчыка – разьба па дрэве. Сваё майстэрства Аляксандр Іванавіч перадае вучням на ўроках працы і ў гуртках дзіцячай творчасці. А яшчэ ён вучыць падлеткаў будаваць мадэлі марскіх і паветраных судоў. Адна з мадэляў, якую настаўнік стварае разам з дзецьмі, – любімага ім самалёта-бамбардзіроўшчыка ТУ-22М2.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Май на ўвазе

# СТАРЫ ХАЛАДЗІЛЬНІК МОЖНА БУДЗЕ ЗДАЦЬ

**У Мінску ўжо ёсць куды здаць стары тэлевізар, халадзільнік і іншую непатрэбную бытавую тэхніку: на вул. Славінскага, 1 адкрыўся новы пункт збору адходаў бытавой тэхнікі. Прымае адходы адкрытае акцыянернае таварыства «БелВТІ» Міністэрства эканомікі. А ў хуткім часе, верагодна, па старую тэхніку будуць прыязджаць на дом.**

— Доўгі час старыя халадзільнікі, пральныя машыны, тэлевізары і іншая бытавая тэхніка ад фізічных асоб адпраўляліся на палігон з наступным пахаваннем. Толькі малую частку другасных матэрыяльных рэсурсаў здабывалі з гэтай катэгорыі адходаў, — сказаў на пасяджэнні «круглага стала» па тэме «Збор і перапрацоўка другасных матэрыяльных рэсурсаў ад насельніцтва ў Беларусі» **супрацоўнік праграмы па хімічнай бяспецы і адходах Цэнтра экалагічных рашэнняў Анатоль КАЛАЧ**. — Ёсць і іншая праблема: трапляючы ў навакольнае асяроддзе, многія кампаненты бытавой тэхнікі могуць нанесці шкоду не толькі прыродзе, але і здароўю чалавека.

Таму ініцыятыву збіраць у насельніцтва электрычнае і электроннае абсталяванне можна толькі вітаць.

— У нашых планах правесці маніторынг, каб зразумець, што жыхары горада ў першую чаргу панясуць здаваць і ў якіх аб'ёмах. Зыходзячы з гэтага, важна вызначыць алгарытм нашых дзеянняў, — паведаміў **генеральны дырэктар таварыства «БелВТІ» Аляксандр КІРПІЧНІК.** — Хутчэй за ўсё, намі будуць распрацаваны інструкцыі па зборы бытавой тэхнікі ў фізічных асоб.

Пакуль аджыўшая сваё бытавая тэхніка прымаецца ў насельніцтва на бязвыплатнай аснове. І прывозіць яе ў пункт збору адходаў трэба самастойна. Зразумела, што пойдуць на гэта толькі самыя свядомыя грамадзяне. Астатнія, напэўна, стануць, як і раней, пакідаць непатрэбную тэхніку каля кантэйнераў са смеццем. Але, як заявіў Аляксандр Кірпічнік: «На працягу месяца мы вызначымся з паслугамі таксі, верагодна, у канцы месяца ўжо пачнём ездзіць па горадзе і забіраць тэхніку з дома. Ужо ёсць заяўкі ад насельніцтва».

**По тэлефоне «гарачай лініі» Грамадскага інфармацыйнага цэнтра 8 (017) 237 40 70 вы зможаце больш падрабязна даведацца, куды можна здаць іншыя віды адходаў.**

Збор падобных адходаў без датацый нявыгадны, бо іх перапрацоўка практычна заўсёды стратная. Сёння перапрацоўшчыкі хаця б часткова кампенсуюць свае выдаткі за кошт здачы чорных і каляровых металаў з адходаў электроннага і электрычнага абсталявання. Між тым, **в.а. дырэктара «Аператара другасных матэрыяльных рэсурсаў» Наталля ГРЫНЦЭВІЧ** упэўнена, што ў бліжэйшы час гэтая праблема будзе вырашана:

**Што можна здаць:**
- ✓**электрычныя і газавыя пліты;**
- ✓**пральныя, пасудамыйныя,**
- ✓**швейныя машыны;**
- ✓**халадзільнікі;**
- ✓**тэлевізары;**
- ✓**мікрахвалевыя печы;**
- ✓**любую камп'ютарную тэхніку;**
- ✓**электрачайнікі, прасы і іншую**
- ✓**дробную бытавую тэхніку;**
- ✓**мабільныя і стацыянарныя тэлефоны.**

«Распрацаваны праект адпаведнай пастановы, які прадугледжвае кампенсацыю расходаў юрыдычным асобам і прыватным прадпрымальнікам за збор адходаў спажывання».

Плануецца, што за тону сабранай складанай бытавой тэхнікі кампенсацыя складзе 2600000 рублёў, за тону пластмасы — 450 тысяч рублёў, за адну лямпу, якая змяшчае ртуць, або тэрмометр — 9000 рублёў. Кампенсацыі прадугледжаны за ўсе віды адходаў спажывання, пра якіх ідзе гаворка ва Указе Прэзідэнта № 313 ад 11 ліпеня 2012 г. «Аб некаторых пытаннях абыходжання з адходамі спажывання».

Калі вышэйзгаданая пастанова ўступіць у сілу, арганізацыі, якія займаюцца зборам адходаў, будуць зацікаўлены ў гэтым і змогуць нават выплачваць нейкую кампенсацыю са сродкаў, выдзеленых ім за збор адходаў спажывання.

**Святлана БУСЬКО** ■

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Тамара ДАЛГАШЭЙ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці:**

*«У краіне неабходна больш актыўна асвойваць выпуск імпартазамяшчальных лекаў. Імпартазамяшчэнне дасць магчымасць вырашыць праблему высокіх цэн на лекі і абараніць ільготныя катэгорыі грамадзян. Ёсць даручэнне кіраўніка дзяржавы аб неабходнасці ў першачарговым парадку асвойваць у Беларусі вытворчасць сацыяльна значных лекаў. Многія прэпараты людзям жыццёва неабходныя, а кошт на замежныя прэпараты звычайна вельмі высокі. Пры гэтым трэба разумець: якасць лекаў вызначаецца не краінай іх вырабу, а кантролем за вытворчасцю, належнай праверкай якасці і наяўнасцю знакаў ISO. Іх маюць усе беларускія заводы».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 03.05.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8660,00 | ▲ |
| Еўра | 11390,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 276,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1069,14 | ▲ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 10° |
| Віцебск | + 14° |
| Гомель | + 20° |
| Гродна | + 14° |
| Магілёў | + 13° |
| Мінск | + 12° |

## ДАЖДЖЫ І ЗАМАРАЗКІ

**Надвор'е рэзка пагоршыць атмасферны фронт, які рухаецца да нас з боку паўднёвага захаду Еўропы, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.**

У суботу часам дождж, месцамі навальніцы. У ноч на суботу 7—14 цяпла, удзень — ад плюс 10—13 градусаў на паўночным захадзе, да 24—26 цяпла па паўднёвым усходзе. 5 мая месцамі будзе іс-ці кароткачасовы дождж, удзень магчымы навальніцы. Уначы плюс 7—14, удзень — да 15—20 градусаў, а на поўдні краіны — да 23 цяпла. У пачатку наступнага тыдня без ападкаў. Уначы 2—8 цяпла, а ў асобных раёнах замаразкі да 0 — мінус 2 градусаў. Удзень будзе да плюс 18—24.

**Сяргей КУРКАЧ.**

УВАГА: «ПРАМАЯ ЛІНІЯ»!

## НАШ КУЛЬТУРНЫ СВЕТ

З чаго ён складаецца, як захоўваецца і ўзбагачаецца? На ўсе пытанні, якія тычацца існавання і развіцця культуры ў Рэспубліцы Беларусь, можна атрымаць адказ з вуснаў міністра культуры Барыса Уладзіміравіча Святлова. «Прамая лінія» пройдзе ў рэдакцыі газеты «Звязда» **23 мая**, час будзе ўдакладнены дадаткова.

Папярэдне пытанні прымаюцца па тэлефоне ў Мінску **287-18-69**, таксама іх можна дасылаць поштай ці на электронны адрас: **info@zviazda.minsk.by** (з паметкай «для аддзела культуры»). Адказы на найбольш цікавыя і актуальныя пытанні будуць надрукаваны ў газеце.

## ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**3 мая 2013 года ў 10.00** у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца чарговае пасяджэнне другой сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ГРУЗІЯ ВОЗЬМЕ ЎДЗЕЛ У АЛІМПІЯДЗЕ Ў СОЧЫ

Нацыянальны алімпійскі камітэт Грузіі прыняў на пазачарговым пасяджэнні рашэнне аб удзеле краіны ў зімовых Алімпійскіх гульнях у Сочы ў 2014 годзе. Як паведамляюць мясцовыя СМІ, рашэнне прынята ўдзельнікамі пасяджэння аднагалосна. Прэзідэнт НАК Грузіі Леры Хабелаў адзначыў, што рашэнне было прынята, «зыходзячы са спартыўных меркаванняў». Нагадаем, паміж Грузіяй і Расіяй дагэтуль няма дыпламатычных адносін.

### ЗША: УКРАІНА — ГАЛОЎНЫ ПАРУШАЛЬНІК АЎТАРСКІХ ПРАВОЎ

Улады ЗША назвалі Украіну галоўным парушальнікам правоў інтэлектуальнай уласнасці, перадае Бі-бі-сі. Паводле звестак Вашынгтона, менавіта ва Украіне становішча з абаронай інтэлектуальных правоў горш, чым у іншых краінах. У справаздачы прадстаўніка ЗША па гандлёвых пытаннях гаворыцца, што Кіеў не змог эфектыўна змагацца з пірацтвам у інтэрнэце. У краіне таксама востра стаіць праблема шырокага выкарыстання нелегальнага праграмнага забеспячэння. Ім карыстаюцца нават у дзяржаўных установах. Паводле слоў прадстаўніка ЗША па гандлёвых пытаннях, калі Кіеў не прыме належныя меры для абароны правоў інтэлектуальнай уласнасці, Украіна пазбавіцца шэрагу гандлёвых ільгот.

### ВІШНЯ ЗНІЖАЕ ВЕРАГОДНАСЦЬ ІНСУЛЬТУ?



Кіслы сорт вішні спрыяльна ўплывае на працу сардэчна-сасудзістай сістэмы і зніжае рызыку інсульту, лічаць амерыканскія даследчыкі з Мічыганскага ўніверсітэта аховы здароўя. Раней навукоўцы ўстанавілі, што вішня кіслых сартоў актывізуе ізаформы PPAR — рэцэптараў, якія ўдзельнічаюць у метабалізме тлушчу і глюкозы, што, у сваю чаргу, зніжае рызыку развіцця сардэчна-сасудзістых захворванняў.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### БЕСПРАЦОЎЕ Ў ЗОНЕ ЕЎРА ПРАЦЯГВАЕ СТАВІЦЬ РЭКОРДЫ




Узровень беспрацоўя ў 17 краінах зоны еўра ў сакавіку дасягнуў рэкордных 12,1%. Пра гэта сведчаць звесткі Еўрастата.

Беспрацоўнымі ў еўразоне ў сакавіку былі 19211 млн чалавек. У 27 дзяржавах ЕС іх колькасць за месяц павысілася на 69 тыс. — да 26521 млн чалавек, а ўзровень беспрацоўя застаўся на лютаўскай адзнацы — 10,9%.

Узровень беспрацоўя сярод моладзі (асобы маладзейшыя за 25 гадоў) еўразоны склаў 24%, у Іспаніі ён перавышае сярэдні паказчык больш чым у два разы і складае 55,9%, у Італіі — 38,4%, у Партугаліі — 38,3%. Усяго пяць гадоў таму паказчык беспрацоўя ў 25% у Еўропе лічыўся не проста непрымальным, а зусім немагчымым.

У параўнанні з сакавіком 2012 узровень беспрацоўя павысіўся ў 19 дзяржавах ЕС і знізіўся ў 8. Значна зменшылася колькасць беспрацоўных у Латвіі (з 15,6% у 2011 годзе да 14,3 у 2012), Эстоніі (з 10,6% да 9,4% за той жа перыяд) і ў Ірландыі (з 15,0% да 14,1%). Максімальны ўзровень беспрацоўя сярод краін еўразоны адзначаны ў Іспаніі — 26,7. У Партугаліі гэты паказчык дасягнуў 17,5%. У Грэцыі ў студзені 2012 года (апошнія звесткі) колькасць беспрацоўных складала 27,2%.

Самы нізкі ўзровень беспрацоўя па-ранейшаму назіраецца ў Аўстрыі — 4,7%, Германіі (5,4%), Люксембургу (5,7%).

КОРАТКА

З 1 мая ў сярэднім на 1,28 працэнта павышаны цэны на звадкаваны газ для камунальна-бытавога спажывання арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі.

3 і 6 мая позна вечарам на праспекце Незалежнасці ў Мінску пройдуць рэпетыцыі роты ганаровай варты да Дня Перамогі. У сувязі з гэтым рух па праспекце ад вул. Купалы да вул. Казлова будзе абмежаваны ў абодвух напрамках з 22.00 да 00.00.

Беларусь атрымала пяты транш крэдыту Антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС у памеры $440 млн.

Дзяржаўны доўг Беларусі на 1 красавіка 2013 года склаў Br131,7 трлн і павялічыўся ў параўнанні з пачаткам 2013 года на Br3 трлн, або на 2,3 працэнта.

Дзяржаўная ўстанова па забеспячэнні спартыўных мерапрыемстваў «Белспортазабеспячэнне» створана ў Беларусі шляхам пераўтварэння рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства па забеспячэнні спартыўных мерапрыемстваў «Белспортазабеспячэнне». Новай арганізацыі дазволена выступаць у якасці заказчыка пры ажыццяўленні ва ўстаноўленым парадку дзяржаўных закупак.

## ЦІ МОЖА ЖАНЧЫНА БЫЦЬ ДОБРАЙ ЖОНКАЙ І МАЦІ І АДНАЧАСОВА ПАСПЯХОВА БУДАВАЦЬ КАР'ЕРУ?



**Іна СЯМЁНАВА, вядучы спецыяліст аддзела чыгуначных перавозак транспартнай кампаніі «ЮніТранс», г. Масква:**

— Можа, было б жаданне. Гэта, я лічу, рухавік прагрэсу, без яго нікуды.

Для мяне значную ролю адыгрывае разуменне людзей, якія мяне акружаюць. Калі ў калектыве цябе цэняць — гэта важна. Прыемна затрымацца на працы дзеля любімай справы. Галоўнае, давесці тое ж да сваёй сям'і, каб родныя таксама гэта разумелі. З аднаго боку, у сям'і можна размеркаваць абавязкі. З іншага, калі цябе няма, то ніхто за цябе нешта не выканае. Такога таксама быць не павінна... Таму галоўнае — разуменне, павага. І тады ўсё атрымаецца: і кар'ера, і сям'я — дзеці, муж, бацькі, якія цябе любяць.



**Вольга ТРУБАЧ, псіхолаг Рэспубліканскага дзіцячага пульманалагічнага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі, вёска Баравыя Мядзельскага раёна:**

— Я лічу, што кожная жанчына ў гэтым пытанні робіць свой выбар, расстаўляе свае прыярытэты. Мяркую, што адначасова быць добрай маці, жонкай і рабіць кар'еру немагчыма. Таму што вышэйназваныя рэчы патрабуюць ад жанчыны стапрацэнтнай аддачы. А калі гэтага не адбываецца, то і ніякай якасці ў дачыненні да гэтых сфер не патрэбна чакаць. Якая можа быць добрая маці, калі яна, гуляючы з дзіцём, будзе думаць не пра «мядзведзіка», а пра новага партнёра па бізнесе? Ці, працуючы па выхадных, пакідаць мужа і дзіця сам-насам, або, у лепшым выпадку, з бабуляй. Напэўна, можна шукаць нейкія кампрамісы. Але кампрамісы — гэта зусім іншая гісторыя.



**Андрэй СІМАНАЎ, упакоўшчык сумеснага таварыства «АлюмінТэхна», г. Мінск:**

— Ці можа? Пэўна ж! Але вось каб ткнуць у каго пальцам... Неяк усе сціпленька працуюць... Сярод тых маіх знаёмых, каго я лічу добрымі жонкамі і маці, здаецца, няма аніводнай, каго б надта турбавала кар'ера. Хутчэй, наадварот. Большасць, не вагаючыся, зменіць месца працы, няхай сабе за меншую аплату і пры больш цяжкіх умовах, калі гэтага вымагаюць патрэбы сям'і.

Некалі мне даводзілася шмат кантактаваць з жанчынамі — індывідуальнымі прадпрымальнікамі. І здаецца, у тых, хто з галавой быў у працы, у сям'і атрымлівалася не ўсё добра. А вось калі муж працаваў, а жонка займалася хатнімі справамі, толькі па неабходнасці дапамагаючы яму, там сітуацыя была куды лепш.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**

# РАЗВІТАЯ СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА — ДАБРАБЫТ НАРОДА І СТАБІЛЬНАСЦЬ ДЗЯРЖАВЫ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Што датычыцца іпатэчнага крэдытавання, то, на думку кіраўніка дзяржавы, яно атрымае развіццё ў Беларусі са зніжэннем працэнтных ставак.

«Іпатэчнае крэдытаванне будзе развівацца. Уся праблема — вельмі высокія працэнты па крэдытах. Таму людзям узяць пад заклад маёмасці або будучага дома гэты крэдыт — вялікая нагрузка», — адзначыў Прэзідэнт. Ён канстатаваў, што цяпер ідзе зніжэнне ставак па крэдытах. «Калі крэдыт будзе каштаваць 5 працэнтаў, максімум 10 працэнтаў — і іпатэка ў нас пойдзе», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы па просьбе студэнтаў расказаў, ці вырашыць энергетычную праблему ў краіне будаўніцтва АЭС.

Прэзідэнт падкрэсліў, што Беларусь будуе АЭС, у першую чаргу, для забеспячэння насельніцтва нармальнымі тарыфамі на электраэнергію. «Перш чым экспартаваць электраэнергію, нам трэба па нармальных цэнах забяспечыць свой унутраны рынак. Усё, што застанецца, мы будзем экспартаваць, калі ў гэтым будзе сэнс, гэта значыць, калі там нам заплацяць больш, чым кошт атрыманай электраэнергіі», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што пакуль у Беларусі не хапае сваёй электраэнергіі. У асноўным яна закупляецца ў Расійскай Федэрацыі. «Больш за тое, у Расіі мы можам купіць электраэнергію танней, чым вырабіць сваю. Таму што не мадэрнізавалі доўга свае энергетычныя прадпрыемствы», — адзначыў Прэзідэнт. Паводле яго слоў, каля $9 млрд у краіне ўжо ўкладзена ў мадэрнізацыю такіх прадпрыемстваў, у бягучай пяцігодцы плануецца поўнасцю завяршыць гэты працэс.

«Так, нешта, напэўна, будзе для экспарту. Я лічу, што ў Еўрасаюзе заўсёды будзе дарагая энергія, і мы зможам нешта прадаць. Але мы будуем АЭС не для таго, каб экспартаваць. Трэба па нармальных тарыфах, нармальных цэнах забяспечыць насельніцтва і сваю вытворчасць электраэнергіяй», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка таксама дадаў, што калі б была магчымасць, ён пачаў бы будаваць у Беларусі другую АЭС. «Калі б у мяне была магчымасць пачаць будаваць цяпер другую атамную станцыю, я абавязкова пачаў бы яе будаваць. Але пакуль няма ні падрадчыка, ні грошай, ні той краіны, якая выдзеліла б крэдыт для будаўніцтва. А пляцоўка ж у нас увогуле ёсць», — сказаў Прэзідэнт.

«Вы нікога не слухайце, што, вось, Чарнобыль, нам гэта станцыя не патрэбна і гэтак далей. Гэта ўсё праплачана. Наша станцыя і расійская ў Калінінградзе — гэта костка ў горле Еўрасаюзу і дзяржавам Балтыі. Яны ўжо спазніліся, у іх не атрымліваецца пабудаваць сваю станцыю, яны будуць нам ужо не канкурэнты і ім давядзецца купляць нашу і расійскую электраэнергію», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, ідзе канкурэнтная барацьба. «І яны нашу пятую калону мабілізавалі на тое, каб змагацца супраць будаўніцтва атамнай электрастанцыі», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт адзначыў, што ў яго на гэта просты адказ: Беларусь з усіх бакоў акружана атамнымі электрастанцыямі. «Мы акружаны ланцугом атамных электрастанцый. Калі зыходзіць з пытанняў бяспекі, то Чарнобыльская АЭС не на нашай жа была тэрыторыі, а хто зведаў гора больш за ўсіх? Мы. Мы ўжо жывём у гэтай небяспечнай зоне. Дык што будзе лепш: калі вакол нас будуць будаваць станцыі, а мы будзем глядзець на чужыя або мы сваю пабудуем?» — спытаў кіраўнік дзяржавы. Таму, паводле слоў Прэзідэнта, тыя, хто выступае супраць будаўніцтва ў Беларусі АЭС, — «праплачаныя Захадам людзі».

Студэнты задалі Прэзідэнту і **шэраг асабістых пытанняў**, пацікавіўшыся, як ён праводзіць вольны час, рэцэптам захавання добрай фізічнай формы. Спыталі і аб яго прагнозах адносна пераможцы ў конкурсе «Еўрабачанне» ў гэтым годзе.

Аляксандр Лукашэнка лічыць песенны конкурс «Еўрабачанне» абсалютна не аб'ектыўным. «Я, можа, больш, чым вы, перажываю за гэты конкурс, хоць добра разумею і ўсведамляю ўсё, што там адбываецца, для многіх з вас гэта скрыта. Я ведаю, што гэта абсалютна не аб'ектыўны конкурс, — заявіў Прэзідэнт. — Любая дзяржава, калі трэба, можа табе даць любы бал, і ўсё, што вы бачыце з экрана, гэтыя балы і гэтак далей — усё гэта фікцыя, шоу».

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, улічваючы, што краіны на «Еўрабачанні» галасуюць у асноўным за сваіх суседзяў, каб перамагчы, трэба паказаць нешта вельмі асаблівае. «Гэты конкурс не зусім аб'ектыўны, і для нас, беларусаў, перамагчы — гэта верх усяго. Не ведаю, што павінна адбыцца», — лічыць Прэзідэнт.

## У МАІ ПАВЯЛІЧАНЫ БЮДЖЭТ ПРАЖЫТКОВАГА МІНІМУМУ НА 5,4%

**Пастановай Саўміна № 319 зацверджаны бюджэт пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва і па асноўных сацыяльна-дэмаграфічных групах у цэнах сакавіка 2013 года ў разліку на адзін месяц. Гэтыя сацыяльныя нарматывы дзейнічаюць з 1 мая па 31 ліпеня.**

Такім чынам, бюджэт пражытковага мінімуму з мая складае 974 тысячы 110 рублёў (з 1 лютага па 30 красавіка ён быў 924 тысячы 150 рублёў).

Для працаздольнага насельніцтва БПМ з мая вызначаны ў памеры 1 млн 74 тысячы 680 рублёў, для пенсіянераў — 803 тыс. 370, для дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў — 846 тыс. 110, для дзяцей ва ўзросце ад 3 да 6 гадоў — 1 млн 79 тыс. 730, для дзяцей ва ўзросце ад 6 да 18 гадоў — 1 млн 93 тыс. 130, для дзяцей-студэнтаў — 975 тыс. 200 рублёў. Новы БПМ павялічыўся ў параўнанні з мінулым нарматывам на 5,4%.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## КАЛІ Ў ПАЛІКЛІНІКАХ БУДЗЕ СУБОТА?

**У сувязі з пераносам рабочых дзён у маі галоўным медыцынскім ведамствам краіны былі ўнесены і змяненні ў графік работы ўстаноў аховы здароўя.**

Амбулаторна-паліклінічныя і санітарна-эпідэміялагічныя ўстановы, арганізацыі пералівання крыві, санітарна-эпідэміялагічныя арганізацыі, аптэкі і арганізацыі медыцынскай тэхнікі будуць працаваць 9 мая — па святочным графіку, 10 і 11 мая — па графіку суботы, 12 мая — па графіку выхаднога дня і ў суботу 18 мая — па графіку рабочага дня. Работа бальнічных устаноў аховы здароўя будзе арганізавана: 9 мая — па графіку святочнага дня, 10 мая — па графіку рабочага дня, 11 мая — па графіку суботы, 12 мая — па графіку выхаднога дня і 18 мая — па суботнім графіку.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## *Ветэранам, камандаванню, прафесарска-выкладчыцкаму складу, слухачам і курсантам Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь*

**Паважаныя таварышы! Віншую вас з 60-гадовым юбілеем Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь.**

За гэтыя гады выпускнікамі акадэміі стала больш за трыццаць тысяч афіцэраў для Узброеных Сіл нашай дзяржавы, а таксама больш за чатыры тысячы ваенных спецыялістаў для армій 38 замежных дзяржаў. Якасць і эфектыўнасць падрыхтоўкі афіцэрскага складу ў Ваеннай акадэміі прызнаны далёка за межамі Беларусі. Сведчаннем таму з'яўляецца зацікаўленасць ваенных ведамстваў краін блізкага і далёкага замежжа ў навучанні спецыялістаў для нацыянальных узброеных сіл менавіта ў нашай навучальнай установе.

Безумоўна, галоўным багаццем акадэміі з'яўляюцца кваліфікаваныя кадры — патрыёты, прафесіяналы найвышэйшага ўзроўню. Упэўнены, маючы магутны інтэлектуальны патэнцыял і вельмі багатыя традыцыі, Ваенная акадэмія ўпіша яшчэ нямала яркіх старонак у развіццё беларускай ваеннай школы і забеспячэнне нацыянальнай бяспекі дзяржавы.

У гэты святочны дзень жадаю ўсім моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту, новых дасягненняў на карысць нашай Радзімы.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

■ Палітычная геаграфія

# БЕЛАРУСКІ ІНТАРЭС У ААЭ

**Як вядома, у канцы сакавіка 2013 года Прэзідэнт Беларусі наведаў з візітам Аб'яднаныя Арабскія Эміраты (ААЭ), дзе правёў перамовы на вышэйшым узроўні з шэрагам высокапастаўленых чыноўнікаў. Чым цікавая для Беларусі гэта краіна?**

У ААЭ пражывае каля васьмі мільёнаў чалавек, што блізка да беларускага ўзроўню насельніцтва. У той жа час плошча гэтай краіны ў два разы меншая. Безумоўна, усім вядома, што ААЭ — краіна, у якой сканцэнтраваны велізарныя запасы нафты і газу, якія паспяхова здабываюцца і экспартуюцца. Так, у 2011 годзе толькі нафты было адпраўлена на экспарт на суму ў 112 мільярдаў долараў. Дасягнуты аб'ём экспарту і здабычы дазваляе ААЭ ўваходзіць у дзясятку сусветных экспарцёраў нафты. Але кіраўніцтва краіны цудоўна разумее, што апора толькі на сыравінную эканоміку небяспечная ў доўгатэрміновай перспектыве. Таму робяцца кардынальныя крокі для стварэння высокатэхналагічнай эканомікі, у якой на грошы ад экспарту энергарэсурсаў ажыццяўляецца стварэнне новых паспяховых прадпрыемстваў, што вырабляюць прадукцыю з высокай дабаўленай вартасцю на экспарт. Гэтую асаблівасць адзначыў і Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, які заклікаў да таго, каб шэраг гэтых новых буйных прадпрыемстваў стварыўся на сумеснай з Беларуссю аснове.

Поспехі ААЭ па мадэрнізацыі і дыверсіфікацыі эканомікі можна зафіксаваць і па рэйтынгу Doing Business-2013 — па выніках 2012 года краіна змагла падняцца ў ім на тры пазіцыі і заняць 26-е месца. Нагадаю, што Беларусь ставіць задачу таксама ўвайсці ў трыццатку краін свету па гэтым рэйтынгу, што дазваляе нам вывучаць і капіраваць вопыт ААЭ. Для гэтага асабліва варта ацаніць вопыт гэтай краіны па лёгкасці выплаты падаткаў (першае месца ў свеце) і трансгранічным гандлі (пятае месца), а таксама па доступе да электраэнергіі для новых бізнес-праектаў (сёмае месца). Па першым з гэтых паказчыкаў у Беларусі — 127 месца, па другім — 151, па трэцім — 171. Дасягненне па гэтых паказчыках узроўню ААЭ якраз і можа дазволіць Беларусі рэалізаваць пастаўленую задачу і патрапіць у трыццатку, паколькі па астатніх паказчыках разрыў з ААЭ не такі і вялікі.

Паміж Беларуссю і ААЭ стаяць задачы па павелічэнні знешняга гандлю і інвестыцый. На 2012 год памер знешняга гандлю дасягнуў амаль 38 мільёнаў долараў, істотна павялічыўшыся ў параўнанні з папярэднім годам. У той жа час патэнцыял для яго росту вялізны. Станоўчым фактарам для Беларусі з'яўляецца ўзрастаючы інтарэс інвестараў з гэтай усходняй краіны. Па выніках 2012 года інвестыцыі павялічыліся ў тры з паловай разы ў параўнанні з 2011 годам, дасягнуўшы лічбы 22,6 млн долараў. Нагадаю, што па выніках візіту Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у гэтую краіну намеснік міністра замежных спраў Беларусі Валянцін Рыбакоў адзначыў, што ААЭ «ўяўляюць для Беларусі інтарэс у якасці інвестара», а сам Аляксандр Лукашэнка праз некалькі дзён паведаміў, што дасягнута дамоўленасць аб тым, што беларускі бок прапануе 5-6 праектаў для інвесціравання. Тавараварот дзвюх краін можа расці ў тым ліку і за кошт выкарыстання ААЭ як пляцоўкі для далейшага экспарту беларускіх тавараў у краіны рэгіёна — гэтая стратэгія рэалізуецца цяпер і ў іншых частках свету.



Фота БЕЛТА.

Сур'ёзны прарыў у развіцці перспектыўных адносін з ААЭ можа быць пацверджаны першым пасяджэннем сумеснага камітэта па супрацоўніцтве паміж урадамі Беларусі і Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў, які прайшоў 24 красавіка ў Мінску. Важным сведчаннем інтарэсу да Беларусі стала тое, што дэлегацыю ад ААЭ ўзначаліў дзяржаўны міністр па замежных справах ААЭ Анвар Гаргаш. На пасяджэнні быў падпісаны мемарандум аб узаемаразуменні па стварэнні сумеснага камітэта па супрацоўніцтве паміж урадамі Беларусі і ААЭ, а міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей адзначыў, што «Аб'яднаныя Арабскія Эміраты — вядучы партнёр Беларусі на Блізкім Усходзе ў палітычным і эканамічным супрацоўніцтве, і мы гатовы пашыраць наша ўзаемадзеянне».

Развіваецца супрацоўніцтва і паміж арганізацыямі, якія спрыяюць росту гандлёвага абароту і інвестыцыям. 25 красавіка Беларуская гандлёва-прамысловая палата і Федэрацыя гандлёва-прамысловых палат Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў падпісалі мемарандум аб узаемаразуменні. Прынята таксама важнае рашэнне ў наступным годзе заснаваць Дзелавы савет па супрацоўніцтве паміж Беларуссю і Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі. Як паказвае вопыт, падобнага роду структуры вельмі эфектыўныя для развіцця гандлю і пошуку новых інвестыцый. Дамовіліся бакі і прапрацаваць пытанне аб арганізацыі сумесных бізнес-форумаў, першы з якіх можа прайсці ўжо сёлета.

Адзначу, што магчымыя і іншыя сферы супрацоўніцтва, акрамя гандлю, развіцця прамысловасці і інвестыцый. Падчас візіту эмірацкай дэлегацыі быў падпісаны Мемарандум аб узаемаразуменні паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў аб супрацоўніцтве ў галіне вышэйшай адукацыі і навуковых даследаванняў. Высокі патэнцыял таксама і ў турызму. Яго развіццю можа паспрыяць і аблягчэнне, а магчыма, у перспектыве, і адмова ад візавага рэжыму паміж нашымі краінамі, што таксама абмяркоўвалася на перамовах.

**Сяргей КІЗІМА, загадчык кафедры міжнародных адносін Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, доктар палітычных навук** ■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## З ПАЧАТКАМ ДАЧНАГА СЕЗОНА — ЗНІЖКА

**Штогод з 1 мая па 30 верасня грамадзяне, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту, маюць права на зніжку ў 50 працэнтаў ад кошту праезду ў цягніках рэгіянальных ліній эканом-класа, водным і аўтамабільным пасажырскім транспарце прыгарадных зносін (акрамя таксі).**

Гэта прадугледжана Указам Прэзідэнта №176 «Аб дзяржаўнай падтрымцы пенсіянераў», нагадалі ў прэс-службе Міністэрства транспарту і камунікацый. Каб скарыстацца зніжкай, неабходна прад'яўленне пенсійнага пасведчання.

## ДАДАТКОВЫЯ ЦЯГНІКІ — ДА МАЙСКІХ СВЯТ

**У дні майскіх свят па Беларускай чыгунцы будуць курсіраваць дадатковыя цягнікі міжнародных, міжрэгіянальных і рэгіянальных ліній. Усяго ў раскладзе руху з'явяцца 100 дадатковых цягнікоў у міжнародных зносінах і 52 — у міжрэгіянальных.**

На 8 мая прызначаны дадатковы цягнік №663 па маршруце Мінск — Брэст. Са сталіцы ён адправіцца ў 18.29 і прыбудзе ў Брэст у 23.20. У зваротным напрамку выправіцца 9 мая ў 5.49 і будзе ў Мінску ў 10.24. 4 і 9 мая будзе дадатковы цягнік № 667/668. Адпраўленне са сталіцы — 12.15, у Брэсце — 16.11. Назад цягнік пойдзе ў 16.49, у Мінску — у 20.43.

На 8 і 9 мая прызначаны дадатковы цягнік № 632 Мінск — Гомель (час адпраўлення — 18.15, прыбыцця — 23.06). З Гомеля поезд №631 адправіцца 9 і 10 мая ў 0.36 і будзе ў сталіцы ў 6.11. Будзе курсіраваць дадатковы цягнік №629 Гомель — Мінск (8, 13-15 мая) і № 630 Мінск — Гомель (9, 14-16 мая).

Па маршруце Мінск — Віцебск — Мінск 8 і 15 мая будзе дадатковы цягнік № 653/654. На 24 мая прызначаны дадатковы цягнік №628 Баранавічы — Мінск і № 627 Мінск — Гродна.

9 і 10 мая прызначаецца дадатковы цягнік № 201/202 Мінск — Вільнюс. З Мінска выходзіць у 8.17, у Вільнюсе — у 11.51. Адпраўленне з Вільнюса — 19.55, прыбыццё — 23.33.

4 і 5 мая будзе курсіраваць дадатковы цягнік № 210 Баранавічы-Палескія — Масква, які адправіцца з Баранавічаў у 18.22. У зваротным напрамку цягнік № 209 адправіцца з Масквы 5 мая ў 13.54, 6 мая — 14.32. 11 мая гэты цягнік адправіцца з Баранавічаў у 13.50 і прыбудзе ў Маскву 12 мая ў 5.08. У зваротным напрамку ён пойдзе з Масквы 12 мая ў 11.33.

На 12 мая прызначаны дадатковы цягнік №230 Мінск — Масква. З нашай сталіцы ён выправіцца ў дарогу ў 22.38 і прыбудзе ў Белакаменную 13 мая ў 9.27. Час адпраўлення назад — 13 мая ў 13.54, час прыбыцця ў Мінск — 23.29.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## КУЛІНАРКА-ВЫПРАБАВАЛЬНІЦА

**Невялічкая форма для выпечкі кексаў з дзіркай пасярэдзіне стала сапраўднай пасткай для пальчыка гадавалай жыхаркі Хойнікаў.**

Бацькі прывязлі дзіця ў мясцовую бальніцу, калі зразумелі, што самі не могуць зняць незвычайны «пярсцёнак». Урачы аперацыю па вызваленні даверылі супрацоўнікам МНС. Тыя пры дапамозе нажніц па метале разрэзалі і знялі форму з пальца рукі дзяўчынкі. Дадатковая медыцынская дапамога дзіцяці не спатрэбілася.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ВЕЛІКОДНУЮ ВЫПЕЧКУ МОЖНА НАБЫЦЬ КАЛЯ ХРАМАЎ

**Напярэдадні Вялікадня выязны гандаль святочнай прадукцыяй наладжвае камунальнае ўнітарнае прадпрыемства «Мінскхлебпрам». Пункты продажу размесяцца каля праваслаўных храмаў сталіцы.**

Гандлёвыя кропкі прадпрыемства будуць працаваць да 4 мая. Адзін з павільёнаў можна будзе адшукаць каля станцыі метро «Няміга» побач з Свята-Духавым кафедральным саборам (вул. Кірыла і Мяфодзія). Другая кропка продажу размесціцца непадалёк ад Свята-Пятра-Паўлаўскага храма (вул. Ракаўская), трэцяя — каля царквы Святой Праведнай Сафіі Слуцкай (вул. Казінца). Акрамя таго, велікодную выпечку ўсе ахвотныя змогуць набыць на пляцоўцы каля кінатэатра «Бярэсце» (пр. газеты «Праўда»).

**«Мінск-Навіны».**

## МЮНХЕН СУПРАЦЬ ДОРТМУНДА

**Кубак Лігі чэмпіёнаў у фінале аспрэчаць нямецкія клубы «Баварыя» і «Барусія».**

Паўторныя паўфінальныя матчы Лігі чэмпіёнаў сенсацыйных вынікаў не прынеслі, а вось задумацца балельшчыкаў наконт гульні сваёй каманды прымусілі.

І найперш гэта тычыцца «Барселоны». Месі і кампанія нічога не здолелі супрацьпаставіць мюнхенскай «Баварыі». Буйна саступілі не толькі ў першай сустрэчы (0:4), але і дома, на вачах 95 тысяч гледачоў прапусцілі ад «чырвоных» тры безадказныя мячы. Калектыў, які заслужана называлі лепшай камандай дзесяцігоддзя, нічога арыгінальнага ў гэтым супрацьстаянні не паказаў. «Упэўнены, ніхто не чакаў ад нас перамогі з агульным лікам 7:0, — адзначае пасля матча Юп Хайнкес, галоўны трэнер «Баварыі». — Я добра знаёмы з іспанскім футболам, асабліва з «Барселонай». Ведаю, як яна любіць гуляць, ведаю яе філасофію. Мая каманда добра ўвабрала ў сябе тактычны план на гульню і ідэальна яго выканала». У іншым паўторным матчы «Рэал» у Мадрыдзе прымаў дортмундскую «Барусію». Між іншым, перамог (2:0), аднак вікторыя была не пераканаўчай, хлопцам Жазэ Маўрыньё не хапіла яшчэ аднаго трапнага стрэлу, каб выйсці ў чаканы фінал. Не атрымалася. Паражэнне 1:4 у Германіі стала для каралеўскага клуба занадта цяжкім для пераканаўчага рэваншу. У выніку мы маем нямецкі фінал, які 25 мая пройдзе ў Лондане на сусветна вядомым стадыёне «Уэмблі».

**Тарас ШЧЫРЫ.**

## І ЗНОЎ — «ЛЕВАЯ» ГАРЭЛКА

**Адна з буйнейшых з пачатку года ў краіне партый кантрафактнай гарэлкі затрымана на трасе М6 у Лідскім раёне, паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама.**

Нелегальную гарэлку (больш за пяць тысяч паўлітровых бутэлек) аператыўнікі па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі выявілі падчас дагляду фуры пад кіраваннем жыхара Гродна ў грузавой частцы аўтамабіля. Ніякіх дакументаў на груз у кіроўцы не было і, да таго ж, на бутэльках адсутнічалі беларускія акцызныя маркі. Паводле інфармацыі праваахоўнікаў, «левая» гарэлка прызначалася для рэалізацыі на тэрыторыі Гродзеншчыны.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

Департамент по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь ЗАРЭГІСТРАВАНА 02 мая 2013 Сушко С.А.

**УТВЕРЖДЕНО**
Общим Собранием акционеров ОАО «Технобанк»
от 02.05.2013 (протокол №6)

## ИЗМЕНЕНИЯ в Проспект эмиссии простых (обыкновенных) акций ОАО «Технобанк», утвержденный Общим Собранием акционеров ОАО «Технобанк» 06.02.2013, протокол №2

1. Пункты 1.12. – 1.14. Проспекта эмиссии изложить в следующей редакции:

**«1.12. Список членов Наблюдательного Совета и Правления эмитента с указанием фамилии, имени, отчества, года рождения, образования, всех занимаемых должностей, в том числе вне органов управления эмитента, в настоящее время и за три предшествующих года, размер доли в процентах, количество принадлежащих им акций по категориям и типам привилегированных акций (долей) в уставном фонде эмитента**

**Список членов Наблюдательного Совета ОАО «Технобанк»**:

Ермоленко Владимир Алексеевич – Председатель Наблюдательного Совета ОАО «Технобанк», независимый директор.

Год рождения: 1953.

Образование: высшее, Белорусский государственный университет, Белорусский государственный институт народного хозяйства им. В.В. Куйбышева.

Занимаемые должности за последние 3 года и в настоящее время: с 04.10.2004 по 26.10.2005 – генеральный директор ИЧУИП «Новый стандарт», с 27.10.2005 по 01.10.2009 – директор СООО «Новый стандарт», с 02.10.2009 по 10.03.2010 – директор ООО «Новый стандарт», с 11.03.2010 по настоящее время – директор ООО «Сити-Строй-Инвест».

Одновременно, с 24.10.2001 по 31.01.2010 являлся Председателем Совета Директоров ОАО «Технобанк», с 01.02.2010 по 31.05.2010 – членом Совета Директоров ОАО «Технобанк», с 01.06.2010 по 27.03.2012 – членом Наблюдательного Совета ОАО «Технобанк», с 28.03.2012 по настоящее время является Председателем Наблюдательного Совета ОАО «Технобанк».

Ермоленко В.А. владеет 150 простыми (обыкновенными) акциями ОАО «Технобанк» (доля в уставном фонде – 0,0004%).

Курач Игорь Александрович – Заместитель Председателя Наблюдательного Совета ОАО «Технобанк», независимый директор.

Год рождения: 1971.

Образование: высшее, Белорусский государственный институт народного хозяйства им. В.В. Куйбышева.

Занимаемые должности за последние 3 года и в настоящее время: с 31.12.2008 по 31.12.2009 – директор ОАО «Универмаг «Гомель», с 03.10.2011 по настоящее время является директором ООО «Техноинжиниринг».

Одновременно, с 30.07.2008 по 31.05.2010 являлся заместителем Председателя Совета Директоров ОАО «Технобанк», с 01.06.2010 по настоящее время является заместителем Председателя Наблюдательного Совета ОАО «Технобанк».

Курач И.А. владеет 7 457 079 простыми (обыкновенными) акциями ОАО «Технобанк» (доля в уставном фонде – 17,4872%) и 2 257 привилегированными акциями ОАО «Технобанк» (доля в уставном фонде – 0,0053%).

Николаевич Михаил Валентинович – Заместитель Председателя Наблюдательного Совета ОАО «Технобанк», независимый директор.

Год рождения: 1959.

Образование: высшее, Белорусский государственный институт народного хозяйства им. В.В. Куйбышева.

Занимаемые должности за последние 3 года и в настоящее время: с 02.01.2003 по 30.06.2009 – исполнительный директор ОАО «Технобанк», с 20.06.2012 по 01.03.2013 – помощник Председателя Правления ОАО «Технобанк».

Одновременно, с 26.03.2008 по 30.06.2009 являлся членом Совета Директоров ОАО «Технобанк», с 01.07.2009 по 31.05.2010 – заместителем Председателя Совета Директоров ОАО «Технобанк», с 01.06.2010 по настоящее время – заместитель Председателя Наблюдательного Совета ОАО «Технобанк».

